# Адміністрацыйныя рэарганізацыі Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

**Зінаіда Васільеўна Антановіч**
https://orcid.org/0000-0003-0702-1915
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Belarusian State University)

**Zarys treści:** Artykuł analizuje stosunek ludności i duchowieństwa mińskiej diecezji rzymskokatolickiej do zmian administracyjno-terytorialnych, które miały miejsce po wcieleniu tych terenów do Imperium Rosyjskiego. Autorka wyodrębniła cztery okresy zmian podporządkowania administracyjnego ziemi mińskiej. W przeciwieństwie do reorganizacji jednostek diecezjalnych innych wyznań chrześcijańskich, zmiany administracyjno-terytorialne mińskiej diecezji rzymskokatolickiej zależały nie tylko od decyzji władz państwowych, lecz musiały być również uzgadniane z papieżem. Inną cechą szczególną było przekazanie diecezji w administrowanie innym podmiotom bez jej terytorialnego rozdrobnienia, co umożliwiło wznowienie działalności rzymskokatolickiej diecezji mińskiej.

**Słowa kluczowe:** diecezja, Kościół rzymskokatolicki, Imperium Rosyjskie, Białoruś, mińska diecezja rzymskokatolicka, reorganizacja administracyjno-terytorialna

**Abstract:** The article examines the attitude of the clergy of Minsk's Roman Catholic Diocese and the population to the administrative-territorial reorganisations that took place during the entry of these territories into the Russian Empire. The author has identified four periods of the changes in the subordination of the Minsk region. Compared with the reorganisation of diocesan units of other Christian denominations, changes in the administrative-territorial obedience of the Minsk Roman Catholic diocese depended not only on the decisions of state authorities but also had to agree with the Pope. Another feature was the transfer of the diocese to the administration of others without its territorial fragmentation. This positively affected the possibility of resuming the activities of the Roman Catholic diocese of Minsk.

**Keywords:** diocese, Roman Catholic Church, Russian Empire, Belarus, Minsk Roman Catholic diocese, administrative-territorial reorganisation

Рэарганізацыі хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях, пачынаючы з першага падзелу Рэчы Паспалітай, у рознай ступені закранулі праваслаўную, уніяцкую і рымска-каталіцкую царкву ў тэрытарыяльным (стварэнне і размежаванне епархіяльных адзінак) і адміністрацыйным (стварэнне органаў кіраўніцтва буйнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, нарматыўнае абгрунтаванне змен і г.д.) аспектах дзейнасці. Першы з пазначаных аспектаў у дачыненні праваслаўнай царквы залежаў ад рашэнняў расійскіх уладаў, якім быў падначалены Сінод, а ўтварэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у цэрквах, якія былі ўзначалены Папай Рымскім, патрабавала таксама ўзгаднення прынятых урадам рашэнняў з вышэйшым канфесіянальным кіраўніцтвам. Напрыклад, на беларускіх землях праваслаўная епархія заставалася ў канцы XVIII ст. толькі адна – Магілёўская, першыя заходы былі накіраваны на яе падтрымку, а іншыя тэрыторыі, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі ў 1772 г. былі далучаны да Пскоўскай праваслаўнай епархіі[1]. У 1793 г. была ўтворана Мінская,

[1] *Полное собрание законов Российской Империи. Собрание первое: в 45 т.*, Санкт-Петербург 1649–1825 (далей: ПСЗРИ I), ст. 13921, 13922.

Ізяслаўская і Брацлаўская епархія (са зменай тэрытарыяльных межаў у 1795 г. – Мінская), а ў 1833 г. – Полацкая епархія. Для іх стварэння прымяняўся ўзор, які быў распрацаваны на працягу XVIII ст. пры рэарганізацыях праваслаўных епархій у Расіі і ўтвараліся адпаведныя адміністрацыйныя органы (архірэйскія дамы, кансісторыі) на чале з епіскапамі, вызначаліся штаты і крыніцы іх камплектавання, фінансаванне. Працэс пачынаўся з падрыхтоўкі Сінодам прадстаўлення імператару, які на падставе звестак выдаваў адпаведны ўказ з магчымымі зменамі па яго меркаванні. Азначаны парадак змяніўся, калі разглядаць на прыкладзе беларускіх зямель, толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст. У прыватнасці, гэтае пытанне стала вырашацца праз меркаванне Дзяржаўнага савета па прадстаўленні обер-пракурора Сіноду, як у дачыненні Гродзенскай епархіі[2]. Аднак, улічваючы глыбокія праваслаўныя традыцыі ў канцы XVIII ст., хуткасць распаўсюджвання інфармацыі і малапісьменнасць насельніцтва значнай рэакцыі грамадства гэта не выклікала, таму што непасрэдна амаль не закранала прыватных асоб.

Іншым чынам сітуацыя складалася ў дачыненні Рымска-каталіцкай царквы. У адрозненне ад праваслаўнай, адной з мэтаў, якія ставілі дзяржаўныя ўлады, было вывядзенне Рымска-каталіцкай царквы з-пад непасрэднага ўплыву канфесіянальнага кіраўніцтва – Апостальскай сталіцы, але главой царквы Папа Рымскі заставаўся. Акрамя таго, Папа з'яўляўся значнай фігурай на еўрапейскай палітычнай арэне, а яго главенства замацоўвалася канонамі рымска-каталіцкай царквы шырока распаўсюджанымі сярод насельніцтва, таму расійскія ўлады не маглі ігнараваць яго пазіцыі, што выклікала шэраг складанасцей падчас адміністрацыйных і тэрытарыяльных рэарганізацый царквы ў Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.[3]

Гэтыя рэарганізацыі знайшлі адлюстраванне ў матэрыялах дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый, органаў канфесіянальнага і дзяржаўнага кіраўніцтва імі, у тым ліку булах і брэве Папы Рымскага, дыпламатычнай перапісцы. У прыватнасці, для даследавання гістарычных шляхоў Мінскай дыяцэзіі неабходны аналіз дакументацыі па стварэнні і ліквідацыі органаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і матэрыялаў па асабовым складзе духавенства (фармулярных спісаў), якія захаваліся ў архіўных фондах Магілёўскай і Віленскай кансісторый[4], а таксама матэрыялаў асабістага паходжання даследчыка гісторыі рымска-каталіцкай царквы на беларускіх землях Я. Фіялка[5], нарматыўных актаў Расійскай імперыі і Папы Рымскага[6]. Гэта дазволіла выявіць перыяды і ўласцівасці адміністрацыйных рэарганізацый Мінскай дыяцэзіі, а таксама стаўленне духавенства і насельніцтва да іх.

## Стварэнне і дзейнасць органаў епархіяльнага кіраўніцтва Мінскай дыяцэзіі

У 1772 г. была створана Беларуская рымска-каталіцкая дыяцэзія, якая стала

[2] *Алфавитно-предметный указатель к официальной части „Церковных ведомостей" за 1898–1910 годы*, Санкт-Петербург 1911, с. 26; *Полное собрание законов Российской империи. Собрание третье : в 33 т. СПб. : Тип. II отд. собств. ЕИВ канцелярии, 1884–1913* (далей: ПСЗРИ III), арт. 17935.

[3] A. Boudou, *Stolica Swięta a Rosja: dyplomatyczne stosunki między niemi w XIX stuleciu*, przekł. Z. Skowrońska, t. 1: *1814–1847*, Kraków 1928, t. 2: *1848–1883*, Kraków 1930; М.Д. Долбилов, *Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II*, Москва 2010.

[4] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: НГАБ), ф. 1781; Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей: LVIA), f. 604.

[5] Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Umiejętności i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie (далей: Bibl. PAU i PAN), rkp. 4808, 4839, 5547.

[6] ПСЗРИ I; *Полное собрание законов Российской Империи. Собрание второе: в 55 т. (1825–1881 гг.)*, Санкт-Петербург 1830–1884 (далей: ПСЗРИ II); *Полное собрание законов Российской Империи. Собрание третье: в 33 т. (1881–1913 гг.)*, Санкт-Петербург 1885–1916 (далей: ПСЗРИ III); *Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкови в империи Российской и царстве Польском*, Санкт-Петербург 1849.

першай рымска-каталіцкай дыяцэзіяй у імперыі. Ва ўказе адзначалася адсутнасць дамоўленасцей з Рымам па гэтым рашэнні дзяржаўных уладаў і неабходнасць вызначэння кандыдатуры на пасаду біскупа. Пры яго прызначэнні на біскупа ўскладаліся абавязкі стварыць кансісторыю, як калегіяльны орган адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва і духоўнага суда[7]. Адпаведна, рэалізацыя адміністрацыйнай часткі ўказа была адцягнута на год, калі беларускім біскупам стаў Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч[8]. Менавіта ён заклаў падмурак для адміністрацыйнай структуры рымска-каталіцкіх дыяцэзій на паставе нарматыўных актаў Расійскай імперыі па справаводстве, а таксама вызначэнні штатаў і дзейнасці органаў епархіяльнага кіраўніцтва, узорамі якіх выступілі дакументы, распрацаваныя для праваслаўнай царквы[9]. У 1782–1783 гг. пад яго кіраўніцтвам гэтая адміністрацына-тэрытарыяльная адзінка набыла на падставе граматы Кацярыны II без папярэдняга ўзгаднення з Апостальскай сталіцай статус архідыяцэзіі[10]. Іншыя рымска-каталіцкія дыцэзіі, у т.л. Мінская, былі ўтвораны па ўказе імператара Паўла I ад 28 красавіка 1798 г., а булай Папы Пія VI ад 15 лістапада іх стварэнне было ратыфікавана на вылучанай з Віленскай дыяцэзіі тэрыторыі Мінскай губерні, а таксама прызначэнне біскупа Якуба Дзядзеркі і ўтварэнне капітулы і кансісторыі[11]. Дарэчы, ствараемая граматай нунцыя Л. Літы Мінская дыяцэзія адзіная сярод каталіцкіх адпавядала імкненню дзяржаўных уладаў па адпаведнасці тэрыторыі епархіяльных адзінак хрысцінскіх цэркваў адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу імперыі[12]. Дакументамі паўнамоцнага прадстаўніка Папы Рымскага вызначаліся склад капітула (прэлаты (прэпазіт, архідыякан, дэкан, схаластык, кусташ і кантар) і канонікі) і кансісторыі (прысутнасць (афіцыял (генеральны вікары), віцэ-вікары і асэсары) і канцылярыя, склад якой не пазначаны ў штатах). Капітул стварайся як орган у абавязкі членаў якога ўваходзіла правядзенне набажэнстваў і разгляд літургічных пытанняў дыяцэзіяльнага характару, апека над хворымі прадстаўнікамі духавенства і выхаванне клірыкаў і каталіцкай моладзі[13]. Кансісторыя ж стала органам адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва дыяцэзіяй і духоўнага суда з правам дарадчага голасу пры кіраўніку дыяцэзіі[14]. Зыходзячы са сферы паўнамоцтваў гэтага органа, якія пазней замацоўваліся ў Статутах духоўных кансісторый[15], можна сцвярджаць, што падчас яго ўтварэння былі скарыстаны ўзоры арганізацыі кіраўніцтва праваслаўнай царквой у Расійскай імперыі, закладзеныя яшчэ Духоўным рэгламентам 1721 г.[16] Афіцыялам Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі ў 1798 г. быў Юзаф Катэнбрынг, віцэ-афіцыялам Тэадор Ванькові, а асэсарамі – Вінцэнт Супіньскі і Серафін Пазажыцкі[17]. Мінская дыяцэзія ўключала па падліках розных даследчыкаў ад 10 да 13 дэканатаў, якія аб'ядноўвалі каля 100 парафіяльных касцёлаў, у якіх

7 ПСЗРИ I, ст. 13922.

8 ПСЗРИ I, ст. 14073, 14122; A. Barańska, *Rzymskokatolicka metropolia mohylewska (1798–1917). Struktury i episkopat*, „Przegląd Wschodni", 14, 2015, 1, s. 48–49.

9 НГАБ, ф. 1781, воп. 2, спр. 2220.

10 ПСЗРИ I, ст. 15326, 15876.

11 НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 240; *Акты и грамоты*, с. 94–121; Bibl. PAU i PAN, rkp. 4808, k. 81–98.

12 ПСЗРИ I, ст. 16658, 19070.

13 *Акты и грамоты* , с. 118–119.

14 ПСЗРИ I, ст. 18504; З. Антановіч, *Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.)*, Мінск 2016, с. 29–35.

15 *Устав духовных консисторий*, Санкт-Петербург 1843; *Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего Синода и правительствующего Сената*, Сост. М.Н. Палибин, Санкт-Петербург 1900.

16 *Духовный регламент всепресветлейшего, державнейшего государя Петра Первого, императора и самодержца всероссийского*, Феофан (Е. Прокопович), СПб. 1721.

17 НГАБ, ф. 1781, воп. 27, спр. 1, арк. 5.

душпастырскую дзейнасць працягнулі 156 прадстаўнікоў духавенства[18].

Дзейнасць Мінскай дыяцэзіі, як самастойнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, працягвалася 71 год. Віленскі, ковенскі, гродзенскі і мінскі генерал-губернатар і галоўны начальнік Віцебскай і Магілёўскай губерняў А.Л. Патапаў 24 ліпеня 1869 г. прадпісаў адміністратару Віленскай дыяцэзіі П. Жылінскаму ў адпаведнасці з паведамленнем міністра ўнутраных спраў ад 14 ліпеня прыняць у кіраванне касцёлы і парафіі, якія ўваходзілі ў Мінскую дыяцэзію, атрымаць справы Мінскіх капітулы і кансісторыі, перавесці выхаванцаў Мінскай семінарыі ў Віленскую, а будынкі кансісторыі і семінарыі перадаць у грамадзянскае ведамства. Члены вышэйазначаных органаў і навучальнай установы былі размеркаваны на іншыя пасады, часта з прызначэннем на ранейшыя месцы служэння і з паніжэннем па іерархіі[19]. У адпаведным ўказе імператар падкрэсліў, што лічыць карысным „Минскую римско-католическую епархию упразднить”[20]. Прычынай падобнага стаўлення з боку дзяржаўных уладаў можна лічыць сукупнасць фактараў ад падзей на грамадска-палітычнай арэне азначаных тэрыторый у другой трэці XIX ст. і ліквідацыі значнай колькасці прадстаўніцтваў рымска-каталіцкай царквы ў Мінскай дыяцэзіі пасля паўстанняў 1830-х і 1860-х гг., да асабовага стаўлення як магілёўскага арцыбіскупа Ю. Станеўскага, так і кіраўніка Віленскай дыяцэзіі П. Жылінскага, які быў схільны да русіфікацыі унутрыкасцёльнага ладу[21]. Гэтае рашэнне было прынята без узгаднення з Папай Рымскім і надалей афіцыйнага пацвярджэння яно не атрымала. Курат Мінскай катэдры, не выказваючы асабістага стаўлення да ліквідацыі органаў кіраўніцтва дыяцэзіяй, толькі цікавіўся ў сваім рапарце да віленскага біскупа, што зрабіць з выдзеленымі на ўтрыманне катэдры і капітула сродкамі[22]. Сакратар кансісторыі Ціт Паразінскі, які заняў аналагічную пасаду ў Віленскай кансісторыі[23], пісаў 31 ліпеня 1869 г. пра складанасці з разборам аргана і неабходным фінансаванні, а таксама прапаноўваў прадаць архіў кансісторыі, за выключэннем метрычных і іншых кніг, таму што яны „совершенно уже не нужны”. П. Жылінскі з ім не пагадзіўся: забараніў прадаваць архіў кансісторыі і прадпісаў яго перавезці і на месцы высветліць, што можа быць знішчана. Аднак гэта не было ажыццяўлена. Пра што паказваюць умовы захоўвання і фізічны стан матэрыялаў дзейнасці Мінскай кансісторыі[24].

Закранула ліквідацыя дыяцэзіі ў значнай ступені выхаванцаў Мінскай семінарыі, у якой ажыццяўлялася падрыхтоўка духавенства не толькі для патрэб адпаведнай дыяцэзіі, але і Магілёўскай архідыяцэзіі, што ў перспектыве стварала праблемы для ратацыі кадраў[25]. З ліку навучэнцаў у Віленскую семінарыю не паехалі вольныя сяляне Антон Іосіфавіч Асельскі і Іосіф Антонавіч Букніс, казённы селялін Падусяцкага сельскага таварыства Ігнацы Іванавіч Урбановіч (ці Урбанас)[26], пінскі мешчанін Антоній Кандрацьевіч Даніловіч і дваране – Маўрыкій Факундавіч Бардзынскі з Барысаўскага пав., Антоній Вікенцьевіч Дэмбскі з Цяльшэўскага пав., Раймунд Іванавіч Мантвід з Ковенскага пав.,

[18] B. Szady, *Rozwój struktur parafialnych i dekanalnych metropolii mohylewskiej (1783–1918)*, „Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej”, 54, 2019, 2, s. 20, 23, 25; Bibl. PAU i PAN, rkp. 4839, k. 68.

[19] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 2–2 адв., 9–9 адв.; ПСЗРИ II, ст. 47307.

[20] ПСЗРИ II, ст. 47307.

[21] M. Radwan, *Polityka wyznaniowa caratu na Białorusi w XIX w. Implekacje duszpasterskie*, „Nasza Przeszłość”, 95, 2001, s. 203–218; J. Wasilewski, *Arcybiskupi i administratorowie archidiecezji mohylowskiej*, Pińsk 1930, s. 78–86.

[22] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 12–12 адв.

[23] *Порядок богослужения для духовенства Виленской епархии на 1870 год*, Вильна 1869, с. 110.

[24] LVIA, f. 694, ap. 1, b. 1893, k. 380–380 v.; НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 14–15 адв.

[25] J. Wasilewski, *Arcybiskupi i administratorowie*, s. 73.

[26] Так у дакуменце.

Канстанцін-Казімір Антонавіч Навіцкі з Новааляксандраўскага пав. і Францішак Казіміравіч Ямонт з Шавельскага пав[27].

Асобных жыхароў Міншчыны цікавілі лёсы спадчыны іх продкаў, якая была прызначана на карысць канфесіянальных устаноў. Так, адстаўны штабс-капітан Іван Іванавіч Рава, пляменнік мінскага біскупа Паўла Равы, звярнуўся да біскупа П. Жылінскага з прашэннем прасачыць лёс 3000 руб. на малітвы ў Мінскай Марыінскай катэдры і 500 руб. на ўтрыманне хору, якія былі выдзелены па тэстаменце П. Равы ў азначаных мэтах і знаходзіліся ў распараджэнні капітула. Высветлілася, што яны разам з іншымі сродкамі былі перанесены ў Вільна і ў Марыінскім касцёле не ажыццяўляліся адпаведныя набажэнствы. І.І. Рава прасіў вярнуць грошы, каб не парушаць апошняй волі продка. Хаця віленскія дыяцэзіяльныя ўлады аргументавалі магчымаць праводзіць аналагічныя набажэнствы ў Вільна, сродкі вярнулі касцёлу[28].

### Адміністраванне Віленскай дыяцэзіі. Спробы русіфікацыі касцёльнага жыцця

Першапачаткова у найменшай ступені падпарадкаванне тэрыторыі Мінскай дыяцэзіі Віленскай адлюстравалася на побыце насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання. Гэта было звязана з ліквідацыяй значнай колькасці парафій у сувязі з грамадска-палітычнымі падзеямі другой трэці XIX ст. Колькасць парафіяльных касцёлаў пры стварэнні дыяцэзіі, як адзначалася, даходзіла да 100, але ў 1860–1865 гг. дзейнічала 73 касцёла, а ў 1867 г. засталося 52. Напрыклад, у Наднёманскім дэканаце было ліквідавана каля паловы прадстаўніцтваў каталіцтва, а Мазырскі і Рэчыцкі дэканаты былі аб’яднаны. У астатніх было 3–5 парафіяльных касцёлаў, за выключэннем Мінскага і Бабруйскага, у якіх было ад 8 да 12 адпаведна. Менш паловы філіяльных касцёлаў было забяспечана духавенствам, а астатнія фактычна прыпынілі сваю дзейнасць. У Навагрудскім і Ствалавіцкім дэканатах адсутнічалі дэканы[29]. Падчас падпарадкавання Віленскай дыяцэзіі колькасць парафіяльных прадстаўніцтваў на тэрыторыі Міншчыны не змянілася[30], аднак аднавіўся кадравы склад за кошт выпускнікоў Віленскай семінарыі, якая стала фактычна адзіным цэнтрам падрыхтоўкі рымска-каталіцкага духавенства. Улічваючы памеры набору і складанасці навучання, яна не магла забяспечыць патрэбы ў душпастырах, а тым больш стварыць магчымасці для павышэння па іерархіі асоб, якія паходзілі з Міншчыны. Акрамя таго, гэты перыяд супаў са знаходжаннем віленскага біскупа Адама Станіслава Красінскага ў ссылцы і адміністраваннем у дыяцэзіі П. Жылінскага, што ўскладняла пастырскую апеку над прадстаўніцтвамі Касцела ў рэгіёне[31].

Значна большая ўвага была нададзена духавенствам увядзенню рускай мовы ў справаводства ў 1840-я гг.[32], святарамі і насельніцтвам – актыўным спробам увядзення рускай мовы ў дадатковыя набажэнствы па распараджэнні 25 снежня 1869 г.[33], што адлюстравалася ў выданні адпаведнай літаратуры і спробах яе актыўнага распаўсюджвання[34], зваротах як

[27] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 54–56, 58.

[28] Тамсама, арк. 63–68 адв., 71–73 адв., 81–84.

[29] З. Антановіч, *Асабісты склад кліру і парафіяльнага духавенства Мінскай дыяцэзіі (паводле фармулярных спісаў рымска-каталіцкага святарства за 1867 г.)*, Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт, рэдкал. Ю. Бохан [і інш.], вып. 12, Мінск, НГАБ, 2014, с. 226–242.

[30] *Порядок богослужения*, с. 161–171; *Ordo divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi in annum domini 1885*, Vilnae 1885, с. 178–190.

[31] T. Krachel, *Zarys dziejów (archi)diecezji Wileńskiej*, „Studia Teologiczne", 1987–1988, 5–6, s. 29.

[32] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 129; LVIA, f. 604, ap. 4, b. 1297.

[33] М.Д. Долбилов, *Русский край, чужая вера*, с. 612–624.

[34] P. Kubicki, *„Trebnik" narzucony przez rząd rosyjski diecezjom: Kowieńskiej, Mińskiej i Wileńskiej oraz historyczny rys walki z nim aż do zupełnego zwycięstwa*, „Wiadomości archidiecezjalne Wilenskie", 1935, 4, s. 35–51; I. Wodzianowska, *Wytyczne Komisji do spraw duchowieństwa w sprawie zwalczania katolicyzmu w generał-gubernatorstwie wileńskim (1866–1868)*, w: *Kościoły a państwo na pograniczu polsko-litewsko-*

дыяцэзіяльных уладаў, так і прыватных асоб і парафій да дзяржаўных уладаў, а таксама шырокія дыскусіі па гэтай тэме. Бакі акцэнтавалі перашкоды з боку кананічнага права і расійскага заканадаўства (па прэцыдэнце 1848 г.)[35], але палітыка працягвалася. Менавіта тэрыторыя Міншчыны стала пляцоўкай для ўвядзення такіх набажэнстваў[36].

### Пад адміністраваннем Магілёўскай архідыяцэзіі

Папа Леў XIII пасля працяглых дыпламатычных перамоў з уладамі Расійскай імперыі булай ад 15 сакавіка 1883 г. аддаў у падпарадкаванне Магілёўскаму арцыбіскупу тэрыторыю былой Мінскай дыяцэзіі, а імператар 16 красавіка выдаў адпаведны ўказ[37]. У адпаведнасці са згаданымі дакументамі, святарам Віленскай дыяцэзіі, якія ажыццяўлялі душпастырскую дзейнасць давалася магчымасць вярнуцца ў сваю дыяцэзію, аднак большасць сваімі рапартамі пацвердзілі жаданне застацца ў сваіх парафіях і тое, што паведамілі пра змены ў адміністраванні парафіянам[38]. Шэраг з іх акцэнтавалі прычыны свайго рашэння, як пробашч Паланечскага касцёла Віктар Лятук, які застаўся ў Мінскай дыяцэзіі толькі па просьбе сваіх парафіянаў. Апошнія таксама звярнуліся да арцыбіскупа, каб пакінуць свайго пробашча ў парафіі. Зварот падпісала 22 памешчыка і 13 непісьменных парафіян[39]. Іншым святарам арцыбіскуп загадаў выехаць, як клецкаму адміністратару Яну Юргевічу ў Віленскую дыяцэзію з-за дрэнных адносінаў з парафіянамі, хаця святар прадставіў подпісы ў сваю падтрымку[40]. Адміністратар Халопеніцкага касцёла Антоній Феліцыянавіч Лазарэвіч (нар. каля 1836 г., шляхецкага паходжання (Слуцкі пав. Мінскай губ.); выпускнік мінскіх гімназіі і семінарыі[41]) выказаў пажаданне застацца ў Мінскай дыяцэзіі, але пры ўмове пераводу яго ў іншае месца, напрыклад, у м. Свіслач Бабруйскага пав. Прычынай падобнага стаўлення сталі пабытавыя складанасці: з 1877 г., калі ён заняў пасаду, нягледзячы на яго намаганні, касцёл не быў адрамантаваны, напрыклад, у плябаніі працякалі сцены і столя, з-за чаго святар захварэў, а парафіяне абыякава ставіліся да яго праблем. Пры гэтым зямельная ўласнасць касцёла таксама не была ўпарадкавана. У мэтах дэманстрацыі ўласнага патэнцыялу А.Ф. Лазарэвіч сцвярджаў, што падчас службы ў Лагойску ён выдаткаваў 800 руб. на рамонт касцёла і ажыццявіў яго пасяхова з дапамогай парафіян, а ў Свіслачы ўжо ўклаў 300 руб., але гэтага было недастаткова[42].

Адміністратар Ракаўскага касцёла Евозафій Карповіч пажадаў вярнуцца ў Віленскую дыяцэзію, дзе ён навучаўся і за кошт якой скончыў духоўную акадэмію[43]. Аналагічнае прашэнне падаў вікары Бабруйскага касцёла Ідэльфонс Юр'евіч Раманоўскі (нар. каля 1813 г., шляхецкага паходжання), які атрымаў адукацыю ў віленскім павятовым вучылішчы і віленскім бернардзінскім кляштары. У розныя перыяды сваёй кар'еры належаў да белага і чорнага духавенства[44]. Ён прасіў яго вызваліць ад душпастырскіх абавязкаў па прычыне сталага ўзросту і накіраваць у Гродзенскі францішканскі кляштар на жыхарства, але яго прасілі застацца з-за недахопу

-białoruskim. *Źródła i stan badań*, red. M. Kietliński, K. Sychowicz, W. Śleszyński, Białystok 2005, s. 189–191.

35 М.Д. Долбилов, *Русский край, чужая вера*, с. 460–485, 603–700.

36 Тамсама, с. 632–649.

37 ПСЗРИ III, ст. 151; Bibl. PAU i PAN, rkp. 5547, k. 31–35.

38 НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 91–93, 100–101.

39 Тамсама, арк. 124–126 адв.

40 Тамсама, арк. 144–145.

41 НГАБ, ф. 937, воп. 6, спр. 107, арк. 115–116, 140 адв.–141; *Directorium persolvendi rite officii divini ac missarum secundum rubricas breviarii et missalis romani, nec non S.R. congr. Decretal ad usum universi cleri saecularis dioeceseos Minscensis pro anno domini MDCCCLXVI*, Typis J. Dworzecki, Minsci 1866, s. 13.

42 НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 114–115.

43 Тамсама, арк. 106–106 адв.

44 НГАБ, ф. 937, воп. 6, спр. 107, арк. 56.–57, 95 адв.–97; *Directorium persolvendi rite officii divini ac missarum*, 1866, s. 12.

святароў[45]. Ігуменскі дэкан Феафіл Вайчынскі прасіў вярнуць яго ў Плоцк (Варшаўская архідыяцэзія), дзе пражываюць яго сваякі з выдзяленнем яму месца. Ён адзначаў, што тут яму «противно все и неприятно», у тым ліку з-за моўнай палітыкі ўладаў. Ен быў настолівы і толькі трэцяе прашэнне да мінскага губернатара ён атрымаў пазітыўны адказ. Ф. Вайчынскі быў пробашчам Бярэзінскай парафіі, а таксама Блонскай і Серафінскай, выконваў распараджэнні па ўвядзенні рускай мовы ў дадатковыя набажэнствы, але на яго пісалі шмат скаргаў[46]. Цікава, што яго прашэнне напісана на рускай мове, у адрозненне ад звароту цімкавіцкага пробашча Людвіка Кулакоўскага[47], які быў арыштаваны 23 красавіка з-за пажараў у м. Капылі і накіраваны ў Слуцкую турму, а 30 жніўня вызвалены па адшуканні вінаватых[48]. За час яго адсутнасці месца было занята іншым святаром, таму ён вымушаны быў жабрачыць. Святар Л. Кулакоўскі 26 ліпеня 1883 г. звярнуўся да магілёўскага арцыбіскупа. У гэтым звароце ен стаў адным з тых, хто ўзняў праблему ўвядзення рускай мовы ў дадатковыя набажэнствы[49]. Святар адзначаў, што мясцовыя жыхары дома размаўляюць па-беларуску, у школе і грамадскіх месцах – па-руску, а часам – па-польску. У 1877 г., калі Слуцк наведваў візітатар, планавалася перавесці яго з Нясвіжа ў Слуцк, але ён быў перамешчаны ў парафію ніжэйшага класу – Цімкавічы, што азначала паніжэнне яго палажэння. Са свайго ўтрымання з 1870 г. на падтрымку Нясвіжскага касцёла Л. Кулакоўскі аддаў каля 260 руб., Слуцкага – каля 500 руб. і амаль столькі ж на Цімкавіцкі касцёл без падтрымкі парафіянаў, а касцёльныя землі былым святаром былі перададзены ў арэнду і іх прыналежнасць разглядалася судом[50]. Яшчэ адзін ксёндз, адміністратар Каменскага касцёла Францыск Урбановіч, які першапачаткова пагадзіўся застацца ў Мінскай епархіі, скардзіўся на патрабаванні правядзення дадаткована набажэнства на рускай мове[51]. Пробашч Нядзведзіцкага касцёла Збігнеў Чайкоўскі таксама падрабязна апісаў складанасці свайго побыту. У прыватнасці, ён прыехаў 16 лістапада 1882 г. ў парафію і знайшоў знішчаную плябанію, а зіма была марозная, таму ён захварэў рэўматызмам і пнеўманіяй. У кастрычніку 1883 г. парафіяне распачалі будаўніцтва дому і напісалі зварот з просьбай пакінуць святара на гэтай пасадзе, але лекары раілі яму хутчэй выехаць у Віленскую губ. Канфесіянальныя ўлады дазволілі яму пакінуць межы архідыяцэзіі, аднак адначасова прапанавалі заняць прывабную вакантную пасаду ў Магілёўскай архідыяцэзіі або Мінскай дыяцэзіі[52].

Пасля шэрагу зваротаў на моўную тэматыку, у сакавіку 1884 г. арцыбіскуп канфідэнцыяльна звярнуўся да мінскага губернатара за тлумачэннямі і акцэнтаваў некананічнасць падобнага патрабавання і яго незаконнасць з пункту гледжання нарматыўных дакументаў, якімі рэгламентавалася дзейнасць рымска-каталіцкай царквы ў Расійскай імперыі[53]. Там не менш, па стане на 2 красавіка 1884 г. у наступных 31 касцёле з 46 пазначаных у пераліку па Мінскай губерні праводзіліся дадатковыя набажэнствы на рускай мове:

45 НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 94–94 адв.

46 Тамсама, арк. 102–103 адв.

47 Кулакоўскі Людвік (нар. каля 1830 г., шляхецкага паходжання, магістр св. Багаслоўя). Пачатковую адукацыю атрымаў у мінская губернскай гімназіі, а духоўную – мінскай семінарыі і Санкт-Пецярбургскай акадэміі. Пасля заканчэння апошняй Л. Кулакоўскі быў прызначаны капелянам Мінскага дабрачыннага таварыства, а затым стаў настаўнікам Закону Божага ў Бабруйскім павятовым вучылішчы. Па распаражэнні губернатара і біскупа ён быў перамешчаны на пасаду адміністратара Недведзіцкага касцёла, а затым ажыццяўляў служэнне ў Капыльскім і Гаенскім касцёлах. У 1866 г. ён быў прызначаны цімкавіцкім пробашчам, НГАБ, ф. 937, воп. 6, спр. 107, арк. 23 адв.–25; *Directorium persolvendi rite officii divini ac missarum*, 1866, s. 12.

48 НГАБ, ф. 937, воп. 6, спр. 107, арк. 23 адв.–25.

49 A. Boudou, *Stolica Święta a Rosja*, t. 2, s. 412.

50 НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 95–99.

51 Тамсама, арк. 157–158.

52 Тамсама, арк. 141–142, 150–151.

53 Тамсама, арк. 158 адв.

Св. Тройцы і капліцы Дабрачыннага таварыства і гімназіі ў Мінску, Камяні, Пяршаях, Свержні, Койданаве Мінскага пав., Бабруйску, Глуску, Свіслачы, Харамцы Бабруйскага пав., Барысаве, Акалове, Дзядзілавічах, Лагойску, Халопенічах, Зембіне, Бярэзіне, Докшыцах Барысаўскага пав., Ігумене, Серафіне, Уздзе, Блоні Ігуменскага пав., Мазыры, Петрыкаве, Капаткевічах Мазырскага пав., Усялюбе Мазырскага пав., Слуцку, Клецку, Капылі, Цімкавічах і Старчыцах Слуцкага пав. У 14 з іх былі вакансіі сярод духавенства. Пры гэтым у касцёлы, дзе было ўведзена набажэнства на рускай мове, прызначаліся арганісты з ліку выпускнікоў Мінскага вучылішча арганістаў[54]. У астатніх 15 касцёлах нават не ўздымалася пытанне аб правядзенні дадатковых набажэнстваў на рускай мове[55].

Незадаволена духавенства было і стаўленнем прадстаўнікоў дзяржаўных уладаў. Так, лагойскі адміністратар Баляслаў-Ян Ліпінскі ў 1884 г. скардзіўся, што па дазволе выехаць у Віленскую дыяцэзію, калі ён прыехаў у Мінск губернатар не выдаў яму білет і сказаў, што за адно слова на польскай мове накіруе яго ў Мінусінск. Б.-Я. Ліпскі не збіраўся скардзіцца. Аднак пасля перамяшчэння яго калег Юзафа Ваяводзскага і Антонія Лазарэвіча, якім губернатар таксама пагражаў, вырашыў параіцца з арцыбіскупам пра тое, як надалей ажыццяўляць душпастырскую дзейнасць. У выніку ен атрымаў адказ устрымацца ад зменаў[56]. На падставе падобных зваротаў, каб пазбегнуць скажэнняў інфармацыі, сярод духавенства Мінскай губерні быў распаўсюджаны цыркуляр арцыбіскупа, у якім прадпісвалася змены ў набажэнствы не ўводзіць, што адпавядала і дэкрэту Папы Рымскага 1877 г.[57] Губернатар жа прытрымліваўся меркавання, што касцёлы, у якіх дадатковыя набажэнствы праводзяцца на рускай мове, павінны працягваць гэтую практыку для забеспячэння душпастырскай апекі над рускамоўнымі парафіянамі, хаця ён прызнаў, што гэта не ўрэгулявана на заканадаўчым узроўні. Супрацьлеглыя пазіцыі выклікалі шырокую дыскусію і перапіску паміж губернатарам і арцыбіскупам[58].

Паказальнымі з'яўляюцца нешматлікія захаваныя лісты парафіянаў, у тым ліку ананімныя. Так, 15 верасня 1884 г. ананім за подпісам „gorliwy Katolik" пісаў арцыбіскупу, што дэкан і пробашч Залатагорскага касцёла Сімеон Макарэвіч, дэкан і Бярэзінскі пробашч Феафіл Вайчынскі, ксёндз Ю. Гаўронскі, а таксама дэкан і бабруйскі пробашч Міхаіл Аляхновіч, дэкан і барысаўскі пробашч Ян Лукашэвіч, Тамкевіцкі пробашч Людвік Кулакоўскі, ігуменскі пробашч Юзаф Бяртовіч ажыццяўлялі рэформу каталіцкіх абрадаў, што абурала скардзячагася. У тым, што адбывалася, ён убачыў шмат агульнага з рэфармаваннем уніяцкай царквы ў Хелмскай дыяцэзіі і гэта выклікала яго непакой[59]. Пра русіфікацыйную палітыку, накіраваную таксама на абмежаванне развіцця рымска-каталіцкай царквы сведчыла таксама і тое, што да пачатку XX ст. зменьшылася колькасць парафій, у прыватнасці, у Барысаўскім дэканаце за кошт Кемешаўскай і Бярэзінскай[60].

### Аднаўленне дзейнасці органаў епархіяльнага кіраўніцтва Мінскай дыяцэзіі

Прыняцце маніфесту аб верацярпімасці ў 1905 г. выклікала змены на канфесіянальнай арэне, што закранула таксама каталікоў Міншчыны, у т.л. інтэнсіфікаваліся канверсіі ў каталіцтва[61]. Напрыклад, у Мінскім дэканаце былі пабудаваны дзве

[54] Тамсама, арк. 196–203, 206–206 адв.

[55] Тамсама, арк. 248–249 адв.

[56] Тамсама, арк. 159–160 адв.

[57] Тамсама, арк. 162; P. Kubicki *„Trebnik"*, s. 48–49.

[58] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 196–203, 206–206 адв.

[59] Тамсама, арк. 237–238.

[60] *Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non dioecesi Minscensi in annum domini 1901*, Typis J. Zawadzki, Vilnae 1900, с. 209–220.

[61] M. Radwan, *Polityka wyznaniowa*, s. 215.

парафіі – св. Сымона і Алены ў Мінску і ў Івянцы[62], а таксама праведзена візітацыя касцёлаўМіншчыны[63]. Падтрыманыя зместам Маніфеста мінскія каталікі на сходзе 29 красавіка 1907 г. абралі некалькі асоб для прадстаўніцтва справы па аднаўленні дзейнасці Мінскай дыяцэзіі і накіравалі прашэнні ў Раду міністраў (26 снежня 1908 г.) ад усіх парафій дыяцэзіі, ліст да Папы Рымскага, копіі з якіх накіравалі з аналагічным прашэннем да арцыбіскупа. Прадстаўнікамі сталі Караль Барысовіч, Казімір Петрайціс, Юзаф Райкевіч, Зыгмунт Свянціцкі, Юзаф Міцкевіч, Мікалай Станевіч, Генрыета Ельская, Юзаф Марыя Нарэйка, Францыск Стажыцкі, Марта Гадачэўская, Юзаф Дашкевіч, Юзаф Дамарацкі, Ян Славінскі, Юзаф Маліноўскі. Яны акцэнтавалі, што былі ліквідаваны толькі органы дыяцэзіяльнага кіраўніцтва, а не дыяцэзія[64], і звярталі ўвагу, на недахоп кадравага забеспячэння, што выклікала зніжэнне маральнасці насельніцтва. У лісце да Папы (гл. дадатак) адзначаліся таксама ўмовы аднаўлення дыяцэзіі, але гэты зварот быў прызнаны міністрам унутраных спраў неабгрунтаваным[65]. Аднак была праведзена візітацыя парафіяльных касцёлаў Наднёманскага, Навагрудскага і Слуцкага дэканатаў у 1910 г., а Барысаўскага, Ігуменскага, Пінскага і Рэжыцка-Рэчыцкага ў 1912–1913 гг.[66]

Пытанне аднаўлення самастойнай дзейнасці дыяцэзіі зноў было ўзнята 30 красавіка 1917 г.[67] Пад уплывам грамадска-палітычных зменаў і пашырэння магчымасцей канфесіянальнага кіраўніцтва быў прызначаны генеральным вікарыем Мінскай дыяцэзіі быў прызначаны Эдуард О'Рурке[68]. Сітуацыя аднаўлення дыяцэзіі ў 1917 г. ўскладнялася ваеннымі дзеяннямі і рэвалюцыйнымі настоямі, што выклікала непакой рымска-каталіцкага і праваслаўнага духавенства. Да мінскага і тураўскага праваслаўнага епіскапа звярталіся прыхаджане шэрагу храмаў Навагрудскага і Барысаўскага паветаў, якія баяліся, што каталікі жадаюць захапіць цэрквы, якія былі перададзены праваслаўнай царкве пасля ліквідацыі рымска-каталіцкіх прадстаўніцтваў. Ён заклікаў да мірнага ўладкавання гэтай праблемы[69]. Аднак, у верасні наступнага году Э. О'Рурке атрымаў іншае прызначэнне. У сваю чаргу мінскім біскупам стаў Зыгмунд Лазінскі, які быў знаёмы з паствай і насельніцтвам як святар мясцовага паходжання, а таксама як удзельнік у візітацыях, якія ажыццяўлялі ў тым ліку на Міншчыне біскупы А. Сымон і Я. Цэпляк, арцыбіскуп В. Ключынскі[70]. Органамі кіраўніцтва сталі курыя, кансіліум (савет) кансультантаў, саветы па адміністрацыйных і адукацыйных пытаннях[71]. Аднак сітуацыя пад уплывам шэрагу фактараў не паляпшалася, а многія касцёлы і парафіі знаходзіліся ў заняпадзе. Гэта адлюстравана ў рапарце капелана Рудні-Шлягіна Юзафа Юлянiна, які наведваў па даручэнні гомельскага дэкана ў 1921 г. касцёлы Мазырскага пав. Ён адзначаў, што мазырская плябанія без вокан і дзвярэй, а ў касцёле, як „пасля пагрому або пажару", разбрасаны літургічныя кнігі і начынне, архіў дэканата. У Петрыкаве брама была забіта, а касцёл

[62] *Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum domini 1912*, С.-Петербургская губернская типография, Санкт-Петербург 1912, с. 119–135; *Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum domini 1917*, Tow. Sztuki Drukarskiej w Piotrogrodzie, Санкт-Петербург 1917, с. 193–207.

[63] W. Czeczott, *Dyecezya Mińska i jej pasterz biskup Zygmunt Łoziński*, Wilno 1925, s. 16–17.

[64] З. Антановіч, *Архівы*, с. 24–25.

[65] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 239–245.

[66] M. Radwan, *Kościół w Rosji i na Białorusi w relacjach duszpasterzy (1892–1926)*, Kraków 1999, s. 133–136.

[67] Bibl. PAU i PAN, rkp. 4839, k. 68.

[68] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 262.

[69] Тамсама, арк. 256, 261.

[70] НГАБ, ф. 3244, воп. 1, спр. 1; З. Антановіч, *Архівы*, с. 25; W. Czeczott, *Dyecezya Mińska*, s. 16, 25–28; M. Radwan, *Kościół w Rosji i na Białorusi*, s. 133–135, 145–163.

[71] *Directorium divini officii et missarum in dioecesi Minscensi pro anno Domini 1920*, Typis A. Rutkowski, Vilnae 1920, s. 6–7.

зачынены. У такім стане знаходзіліся не толькі названыя касцёлы[72].

Такім чынам, на падставе адміністрацыйных змен у дзейнасці Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі можна вылучыць чатыры перыяды. У першы перыяд (1798–1869 гг.) на падставе дамоўленасцей паміж органамі дзяржаўнай улады і Папай Рымскім і ўзору, выпрацаванаму падчас утварэння і рэарганізацыі Магілёўскай дыяцэзіі, дыяцэзія ўтвараецца і вызначаюцца яе тэрытарыяльныя межы (Мінская губернія) на падставе агульнадзяржаўнага межавання, якія змяніліся з выдзяленнем двух дэканатаў па канкардаце 1847 г., але не выклікалі значных змен адміністрацыйнага характару. Пачынаюць дзейнічаць біскуп і орган адміністрацына-тэрытарыяльнага кіраўніцтва – кансісторыя, дарадчы і дапаможны калегіяльны орган пры біскупе – капітул, а таксама ўтвараецца навучальная ўстанова для падрыхтоўкі духавенства – семінарыя. У парафіяльных касцёлах працягвала душпастырскую дзейнасць святарства, для якога, як і для насельніцтва, з'явіліся менш тэрытарыяльна аддаленыя органы для зваротаў па функцыянальных і маральна-этычных пытаннях, што ў цэлым было пазітыўна прынята грамадствам. У 1869 г. тэрыторыя Мінскай дыяцэзіі перадаецца ў падпарадкаванне Віленскай дыяцэзіі, што стала пачаткам другога перыяду яе функцыянавання. Гэта супала са спробамі ўвядзення рускай мовы ў дадатковыя набажэнствы, што выклікала супраціў значнай часткі духавенства і грамадства. Негатыўна на развіцці каталіцтва на Міншчыне адбілася высылка віленскага біскупа А. Красінскага і адміністраванне дыяцэзіяй П. Жылінскага, што прадстаўляла магчымасці для русіфікацыйных заходаў прадстаўнікоў дзяржаўнай улады і прыводзіла да кадравага недахопу, які пачаўся ў сувязі з грамадска-палітычнымі падзеямі 1830-х і 1860-х гг. Прыкладам увагі кіраўнцтва Віленскай дыяцэзіі можа быць лёс архіва Мінскай кансісторыі, які знаходзіўся ў неўладкаваным стане, а значыцца не мог выкарыстоўвацца ў інтарэсах жыхароў Мінскай губерні. Пры адсутнасці біскупа не ажыццяўляліся візітацыі, што пагаршала стан пастырскай апекі над насельніцтвам. Падобная сітуацыя працягвалася да 1883 г., калі азначаныя тэрыторыя былі падпарадкаваны непасрэдна кіраўніцтву магілёўскага арцыбіскупа (трэці перыяд). Нягледзячы на наружанасць яго працы, а таксама кансісторыі і капітула, жыхары Міншчыны адчулі большую зацікаўленасць дыяцэзіяльнага кіраўніцтва. Пытанні прыватных асоб і духавенства ўважліва разглядаліся, у тым ліку звароты па моўным пытанні ў дзейнасці царквы. Духавенства атрымала магчымасці перамяшчэння ў дыяцэзіі, з якіх паходзіла і навучалася, аднак кадравы недахоп прыводзіў да прапаноў застацца на месцы служэння. Значнай падзеяй для каталікоў Міншчыны стала аб'яўленне маніфесту 1905 г. Грамадства выступіла ініцыятарам адраджэння незалежнага адміністравання Мінскай дыяцэзіі і пачало звяртацца да дзяржаўных і канфесіянальны улад у Расійскай імперыі і Папы Рымскага, але гэтая заходы атрымалі падтрымку толькі ў 1917–1918 гг. (чацвёрты перыяд), аднак ваенныя дзеянні і змены на грамадска-палітычнай арэне імперыі не дазволілі цалкам аднавіць дзейнасць Мінскай дыяцэзіі і з 1920-х гг. пачынаецца яе заняпад з кіраўніцкага і кадравага пункту гледжання.

Нягледзячы на тое, што адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэарганізацыі ажыццяўляліся ва ўсіх епархіяльных адзінках хрысціянскіх канфесій у Расійскай імперыі, у дачыненні Мінскай дыяцэзіі яны мелі выразную спецыфіку, адлюстраваную ў інтэнсіўных стасунках з Папам Рымскім, які ратыфікаваў змены, і адсутнасць тэрытарыяльнага драблення дыяцэзіі падчас яе перападпарадкаванняў.

[72] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 275–276.

Гэта і знешнія абставіны сталі фактарамі, якія дазволілі ў час паслаблення канфесіянальнай палітыкі дзяржавы акумуляваць духавенства і насельніцтва ў спробах аднаўлення дыяцэзіі і дасягнуць гэтага.

## ДАДАТАК

### Зварот жыхароў Мінскай губерні рымска-каталіцкага веравызнання да Папы Пія Х аб аднаўленні Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі, 25.01.1909[73]

[242] Ojcze Swięty!
Za panowania Ojca Swiętego Papieża Pius VI, na mocy bulli z 15 dnia listopada 1798 r. wydanej we Florencyi, utworzone zostało, w granicach Minskiej gubernii, Minskie Rzymsko-Katolickie biskupstwo z 232.000 wiernych i zestałem zamieszkaniem biskupa w gubernijalnem miescie Minsku, środki na utrzymanie którego z klerem były nadane ukazem Cesara Rossyjskiego Pawła I w dzien 28 kwietnia 1798 r. i otoż takowe biskupstwo, chociaż do dzisiejszego dnia kanonicznie nie przestało istnieć lecz biskup Minski w roku 1869 z rozporządzenia władzy cesarsko-rossyjskiej został wywieziony do m. Wilna, a zarządzanie dyecezyą Minską najrzód przeszło do m. Wilna, a potem do Petersburga w ręce Arcybiskupa dyecezyi Mohylewskiej.

Słusznych powodow na usunięcie z Minska biskupa nie było, albowiem liczba wiernych kościołowi Katolickiemu, nie zważaiąc: naprzód na oderwanie od [242v] gubernii Minskiej i przyłączenie do Wilenskiej najwięcej katolickich powiatów Wilejskiego i Dzisnieńskiego, a potem na ucisk i wszelkie ograniczenia, nie tylko nie zmniejszyła się lecz napszeciw wzrosła i obecnie, według urzędowo-statystycznych wiadomości w gubernii Minskiej, obejmującej 78.500 kwadratowych wiorst, czyli 89.333 kw. Kilometrów, znajduje się wyżej 255.000 katolików, potraebujących duchownego pasterza, Arcybiskup zaś Mohylewski nie jest w stanie zaspokoić potrzeb nawet *swej*[74] olbrzymiej dyecezyi, nie mówiąc już o tem, że Peterburg leży od Minska za 804 wiorst, i że wyjazd jego z Peterburga do Mińszczyzny jest połączony z wielkiemi trudnościami, gdyż ową sprawę decyduje ministeryum spraw wewnetrznych po uprzedniem porozumieniu się z minskim prawosławnym archijereiem.

Fundusze kościelne, należące do kapituły dyecezyi Minskiej, naprzykład: mury pofranciszkańskie w których biskup poprzednio miał mieszkanie, mury podominikańskie, w których znajdowały się seminarium i [243] i kosciół i część murów kościoła katedralnego, po usunięciu z Minska biskupa, cesarski rząd wziął pod swój zarząd, z których część odsprzedał, a drugą po rozlokowaniu w murach wojska, odał, za przejściem wojskowo-kwaterunkowej sprawy na obowiązek miasta, Minskiemu miastowemu zarządowi, który po przejściu dziesięcioletniej „dawności", jako własciciel, zatwierdił się w „prawach" własności.

Z powyższego widać że nam odjęto pasterza i wszelkie środki na jego utrzymanie, ale wiara w Jezusa Chrystusa i lepszą przyszłość, switająca nam po ukazie tolerancyjnym Wielkodusznego Cesarza Mikołaja II szczęszliwie panującego, wydanym w r. 1905 dnia 17 kwietnia, przy nas się została. A przeto ufni będąc w Wolę Bożą,

[73] НГАБ, ф. 1781, воп. 32, спр. 212, арк. 242–243 адв. Дакумент прадстаўляе сабой копію арыгінальнага ліста, напісанага на лацінскай мове і адпраўленага Папе Рымскаму Пію Х. Копія была накіравана магілёўскаму арцыбіскупу. Прадстаўлены варыянт напісаны на двух паралельных паловах аркуша на лацінскай і польскай мовах. У якасці дадатку перадаецца тэкст польскамоўнага варыянта звароту, напісаны на левай палове аркуша.

[74] Напісана над радком.

udajemy się do Ciebie, Ojcze Swięty z pokorną prośbą o naznaczenia dla dyecezyi Minskiej biskupa, który by stale mieszkał w Minsku i o wyjednanie u rządu rossyjskiego przywrócenia ukazu Cesarskiego z dnia 28 kwietnia 1798 r. którym były wyznaczone: biskup, jego sufragan, kapituła i seminaryum [243 v.] duchowne, i zwrotu kapitulnych funduszów. Korzystając z powyższego prosimy o błogosławieństwo Apostolskie.

Mińsk. Dnia 25 stycznia 1909 roku

Na oryginale sześćset osiem podpisów (608) ■

## Бібліяграфія

### Крыніцы (Археаграфічныя публікацыі і даведнікі)

*Directorium divini officii et missarum in dioecesi Minscensi pro anno Domini 1920*, Typis A. Rutkowski, Vilnae 1920.

*Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non dioecesi Minscensi in annum domini 1901*, Typis J. Zawadzki, Vilnae 1900.

*Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum domini 1912*, С.-Петербургская губернская типография, Санкт-Петербург 1912.

*Directorium divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum domini 1917*, Tow. Sztuki Drukarskiej w Piotrogrodzie, Санкт-Петербург 1917.

*Directorium persolvendi rite officii divini ac missarum secundum rubricas breviarii et missalis romani, nec non S.R. congr. Decretal ad usum universi cleri saecularis dioeceseos Minscensis pro anno domini MDCCCLXVI*, Typis J. Dworzecki, Minsci 1866.

*Ordo divini officii et missarum pro archidioecesi Mohiloviensi in annum domini 1885*, Vilnae 1885.

*Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкови в империи Российской и царстве Польском*, Санкт-Петербург 1849.

*Алфавитно-предметный указатель к официальной части „Церковных ведомостей" за 1898–1910 годы*, Санкт-Петербург 1911.

*Духовный регламент всепресветлейшего, державнейшего государя Петра Первого, императора и самодержца всероссийского*, Феофан (Е. Прокопович), СПб. 1721.

*Полное собрание законов Российской Империи. Собрание первое: в 45 т.*, Санкт-Петербург 1649–1825.

*Полное собрание законов Российской Империи. Собрание второе: в 55 т. (1825–1881 гг.)*, Санкт-Петербург 1830–1884.

*Полное собрание законов Российской Империи. Собрание третье: в 33 т. (1881–1913 гг.)*, Санкт-Петербург 1885–1916.

*Порядок богослужения для духовенства Виленской епархии на 1870 год*, Вильна 1869.

*Устав духовных консисторий*, Санкт-Петербург 1843.

*Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего Синода и правительствующего Сената*, Сост. М.Н. Палибин, Санкт-Петербург 1900.

### Гістарыяграфія

Barańska A., *Rzymskokatolicka metropolia mohylewska (1798–1917). Struktury i episkopat*, „Przegląd Wschodni", 14, 2015, 1, s. 47–96.

Boudou A., *Stolica Święta a Rosja: dyplomatyczne stosunki między niemi w XIX stuleciu*, przekł. Z. Skowrońska, t. 1: *1814–1847*, Kraków, Wydawnictwo księży Jezuitów, 1928, t. 2: *1848–1883*, Kraków 1930.

Czeczott W., *Dyecezya Mińska i jej pasterz biskup Zygmunt Łoziński*, Wilno 1925.

Krachel T. *Zarys dziejów (archi)diecezji Wileńskiej*, „Studia Teologiczne", 1987–1988, 5–6, s. 7–72.

Kubicki P., *„Trebnik" narzucony przez rząd rosyjski diecezjom: Kowieńskiej, Mińskiej i Wileńskiej oraz historyczny rys walki z nim aż do zupełnego zwycięstwa*, „Wiadomości archidiecezjalne Wilenskie", 1935, 4, s. 35–51.

Radwan M., *Kościół w Rosji i na Białorusi w relacjach duszpasterzy (1892–1926)*, Kraków1999.

Radwan M., *Polityka wyznaniowa caratu na Białorusi w XIX w. Implekacje duszpasterskie*, „Nasza Przeszłość", 95, 2001, s. 197–240.

Szady B., *Rozwój struktur parafialnych i dekanalnych metropolii mohylewskiej (1783–1918)*, „Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej", 54, 2019, 2, s. 5–42.

Wasilewski J., *Arcybiskupi i administratorowie archidiecezji mohylowskiej*, Pińsk 1930.

Wodzianowska I., *Wytyczne Komisji do spraw duchowieństwa w sprawie zwalczania katolicyzmu w generał-gubernatorstwie wileńskim (1866–1868)*, w: *Kościoły a państwo na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim. Źródła i stan badań*, red. M. Kietliński, K. Sychowicz, W. Śleszyński, Białystok 2005, s. 173–198.

Антановіч З., *Асабісты склад кліру і парафіяльнага духавенства Мінскай дыяцэзіі (паводле фармулярных спісаў рымска-каталіцкага святарства за 1867 г.)*, Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт., Вып. 12, рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.], Мінск, НГАБ, 2014, с. 226–242.

Антановіч З., *Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.)*, Мінск 2016.

Долбилов М.Д., *Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II*, Москвба 2010. ■

## Administrative and territorial reorganisations of the Minsk Roman Catholic Diocese between the late eighteenth and early twentieth centuries

### Summary

Based on administrative changes in the Minsk Roman Catholic diocese activity, four periods can be distinguished, each of which is also characterised by changes in the environment of the clergy and parishioners. If the establishment and independent functioning of the diocese and its management bodies did not cause a negative attitude among the population of the Roman Catholic faith and the clergy, then the subordination of the administration of the Vilnius Diocese was aggravated by the attempts of the state authorities to introduce the Russian language in additional services and the lack of personnel, which was also influenced by the of Russification policy of the state authorities. During the subordination of the Mogilev archdiocese, attention to the territory of the Minsk region and its population on the part of the religious authorities increased slightly. Still, the main changes were caused by the Manifesto of 17 October 1905. This document allowed people and the clergy to initiate the restoration of the independence of the diocese, which was achieved in 1917–1918. At the same time, compared to the reorganisation of diocesan units of other Christian denominations, changes in the administrative subordination of the Minsk Roman Catholic diocese depended not only on the decisions of the state authorities but also had to be agreed with the pope. Another property was transferring the diocese's territory to the administration of others without crushing it. This, together with the growth of social activism and relaxation in the confessional arena of the Russian Empire, had a positive impact on the possibilities of resuming the activities of the Roman Catholic diocese of Minsk. ■

**Зінаіда Васільеўна Антановіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сфера яе навуковых інтарэсаў ахоплівае гісторыю, арганізацыю справаводства і архіўнай справы ў органах канфесіянальнага кіраўніцтва і прадстаўніцтвах канфесій на беларускіх землях у канцы XVIII–пачатку XX ст. і крыніцавы патэнцыял матэрыялаў іх дзейнасці, а таксама лёсы прадстаўнікоў духавенства
(zinantonowicz@gmail.com)

**Zinaida V. Antanovich,** PhD (history) – associate professor; the Department of Source Studies, Faculty of History, Belarusian State University. Her academic interests are focused on history, records management and archives of administrative bodies and different Churches in Belarus from the late 18th to the early 20th century, their archives as historical sources, as well as the fates of the clergy
(zinantonowicz@gmail.com)

**Dr Zinaida W. Antanowicz** – docent historii; Katedra Źródłoznawstwa, Wydział Historyczny Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Jej zainteresowania naukowe obejmują historię, zarządzanie dokumentacją i archiwami organów administracyjnych i różnych Kościołów na Białorusi od końca XVIII do początku XX w., ich archiwa jako źródła historyczne, a także losy duchowieństwa (zinantonowicz@gmail.com)